Урокі выхавання

ВА ЎСІМ ВІНАВАТАЯ МАТЫВАЦЫЯ,

або Як навучыць вучыцца

Як бы ні суцяшалі бацькі сябе тым, што адзнакі — не паказчык ведаў, практыка ўсё ж паказвае, што часцей на справе яны дэманструюць не толькі ўзровень ведаў, але і ўзровень матываванасці дзіцяці да развіцця. А што рабіць, калі ў яго няма жадання вучыцца? Ці калі жаданне з узростам знікла? Як наогул дапамагчы маленькаму чалавеку? На гэтыя пытанні адказала псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей Вольга МАСКАЛЕНКА.

— У дзяцей не бывае лянoты, — лічыць псіхолаг. — Да сямі гадоў у малых галоўным відам дзейнасці павінна быць гульня. Пасля сямі — вучоба, потым — работа. Калі дзіця легла на ложак і не хоча вучыцца, трэба разбірацца, што было да гэтага. Можа, бацькі перагрузілі гурткамі ці знік кантакт з роднымі... Бывае, што ў малога нешта не атрымліваецца ці ў яго праблемы з аднакласнікамі і настаўнікамі, а можа, павысілася па нейкіх прычынах трывожнасць. У такіх выпадках нельга адназначна сказаць, што менавіта здарылася. Можна паспрабаваць разабрацца самім бацькам, калі яны ў кантакце з дзіцем. Калі не, то лепш звярнуцца да псіхолагаў, якія дапамогуць разабрацца ў праблеме індывідуальна. У іншых выпадках трэба працаваць з матывацыяй.

Дзяцінства, на думку спецыяліста, доўжыцца да 25 гадоў. Да 12 гадоў — тыповае дзяцінства, якое характарызуецца фантазійным мысленнем. У гэтым узросце дзеці вераць у Дзеда Мароза ды феяў, і ім цяжка рэфлексаваць. Пасля ідзе падлеткавы перыяд, у гэтым узросце дзеці пачынаюць шуткаваць, падколваць дарослых, знікае вера ў казкі. Аднак падлеткавасць — гэта не пра дарасласць і прыняцце спелых рашэнняў. У 18 гадоў па пашпарце ў нашай краіне чалавек лічыцца дарослым, але на самай справе — гэта ўзрост больш дарослага падлетка. Толькі прыкладна да 23 гадоў чалавек пры добрых умовах развіцця і правільным пераадоленні ўзроставых крызісаў ужо навучыцца разумець, што ён адчувае, навучыцца выбудоўваць «дарослыя» межы і не парушаць чужых. У залежнасці ад таго, як праходзіць перыяд дзяцінства, могуць узнікаць праблемы з матывацыяй да вучобы і ўвогуле развіцця. Матывацыя можа быць унутраная і знешняя.

— Калі ў дзіцяці нешта добра атрымліваецца, то ўзнікае пачуццё задаволенасці сабой і сваёй дзейнасцю, — тлумачыць Вольга Маскаленка. — Гэта дазваляе нарадзіцца ўнутранай матывацыі, якая можа датычыцца і дзейнасці, і навучання. Напрыклад, у дзіцяці добра атрымалася спячы пячэнне. Яму хочацца рабіць гэта яшчэ, а потым і паэксперыментаваць у гэтым кірунку. Так спрацоўвае ўнутраная матывацыя і са школьнымі прадметамі. Такую матывацыю дарослым вельмі важна падтрымліваць і падмацоўваць, даваць ёй развіццё і ўдасканальваць.

Каб падтрымаць развіццё ўнутранай матывацыі ў дзіцяці, дарослым трэба стаць вельмі ўважлівымі назіральнікам. Нельга навязваць свае патрэбы дзецям. Прыкладна ў трохгадовым узросце ў дашкольніка здараецца першы ўзроставы крызіс. Ён пачынае аддзяляць сябе ад маці, адчувае, што яму не заўсёды хочацца рабіць тое, што яго просяць бацькі.

— Задача бацькоў — убачыць, што падабаецца рабіць малому, — лічыць псіхолаг. — І паспрабаваць тое развіць. Гэта можа быць спорт, музыка, маляванне, лепка, канструктар, робататэхніка ды ўсё, што заўгодна...

Знешняя ж матывацыя ўзнікае ўжо з дапамогай людзей і нейкіх вонкавых сітуацый. Гэта самая распаўсюджаная матывацыя ў нашых людзей. «Калі зараз не зраблю дамашняе заданне, то атрымаю двойку, а там і пакаранне ад бацькоў», — думае дзіця. І робіць часта не таму, што яму цікава, а каб двойку не атрымаць.

З такой матывацыяй адносіны ў дзяцей вельмі няпростыя. Прыклад з музычнай школай. Многія дзеці вельмі хочуць у яе паступіць, пачынаюць вучыцца і праз гады два ўжо мараць пакінуць гэтую ўстанову.

— Калі дзіця не ўлавіла «кайф» ад пераадолення цяжкасцяў і атрымання вынікаў, то так, хутчэй, і адбудзецца, — мяркуе спецыяліст. — Тут галоўнае для бацькоў — не перацiснуць! Захоча дзіця потым музыкай займацца, няхай займацца, калі падрасце і рашэнне будзе свядомае і ўнутрана матываванае. А дарослыя, калі вырашаюць, кінуць дзіцяці «музыкалку» ці не, таксама робяць выбар: заставацца бацькамі ў кантакце з дзіцем ці «націснуць» і страціць добрыя адносіны. Канешне, вучыць пераадольваць цяжкасці важна, але калі дарослы адчувае, што далей толькі «вайна», лепш адступіць. І паспрабаваць дзесяць кірункаў дзейнасці, але каб дзіця «гарэла» справай, а не давесці адно, але адбіць жаданне наогул спрабаваць нешта новае.

Пасля 12 гадоў знешняя матывацыя становіцца больш значная для падлетка, чым унутраная. Акружэнне і сябры аказваюць велізарны ўплыў на яго, таму бацькам так важна быць з дзіцем у кантакце і ствараць вакол яго пэўнае асяроддзе. Калі ж дзіця да 9 класа так і не вызначылася для сябе, чым хацела б займацца, можна падключыць да справы псіхолагаў-прафарыентолагаў. Яны дапамогуць знайсці «зоны адоранасці» дзіцяці, «уключыць» унутраную матывацыю.

— І наогул у чалавека ўсё жыццё наперадзе, — упэўнена спецыяліст. — Нармальна і ўжо дарослым мяняць прафесіі, здабываць новыя навыкі і спрабаваць рознае. Галоўнае, улавіць кантакт з патрэбай развівацца і атрымліваць ад гэтага стану асалоду.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Лайфхакі, якія настрояць на вучобу

РАБОЧАЕ МЕСЦА

Усе ведаюць пра тое, што святло павінна падаць збоку, а спіну трэба трымаць прама. Але на практыцы дарослыя самі часта чытаюць ці робяць працу лежачы. Дзеці робяць тое самае. І шмат губляюць, бо няправільна ўладкаванае рабочае месца зніжае эфектыўнасць.

Вылучыце дзіцяці асобнае месца для заняткаў — гэта дапаможа правесці мяжу паміж вучобай і ўсім астатнім. Перыядычна звяртайце ўвагу на тое, каб на стале быў парадак. Кацярына Ленгольд у кнізе «Проста космас» нагадвае: «Хаос на рабочым месцы абмяжоўвае здольнасць мозгу апрацоўваць інфармацыю. Беспарадак «загружае» мозг, ствараючы шум, які перашкаджае канцэнтравацца».

ПЛАНАВАННЕ

Адзін з галоўных навыкаў у вучобе — планаванне. Калі не дапамагчы дзіцяці авалодаць ім, то яно будзе дрэнна спраўляцца з заданнямі, не зможа ўкласціся ў тэрміны і нават можа страціць упэўненасць у сабе. Планаванне не патрабуе шмат часу, дастаткова адводзіць 10 хвілін на складанне штодзённага плана. Усталюйце ў тэлефоне або на камп'ютары напаміны аб ключавых датах і тэрмінах. Выбірайце зручны варыянт для вашага дзіцяці. Аднаму падыдзе раздрукоўка, іншаму — мабільнік.

САЧЫЦЕ ЗА АДПАЧЫНКАМ!

Часам тэмп жыцця дзіцяці ўражвае: школа, рэпетытары, курсы, секцыі... Ператамленне і выгаранне — пастка, якая чакае на шляху да поспеху загружанага малога. Таму абавязкова плануйце час для адпачынку і сачыце за рэжымам сну. Недахоп сну негатыўна адбіваецца на ўвазе, здольнасці да мэтанакіраванай дзейнасці, рабочай памяці, настроі, лагічным мысленні і нават на маторыцы. Ідэальная колькасць сну не вызначана, але ў сярэднім гэта 8 гадзін для дарослых і не менш як 9 гадзін для дзяцей.

Сацыяльная кансультацыя

РЭАЛЬНАЯ ДАПАМОГА

На якую падтрымку могуць разлічваць дзеці і моладзь?

«Раскажыце, калі ласка, пра меры сацыяльнай падтрымкі дзяцей і моладзі ў нашай краіне. Ад чаго яна залежыць і каго датычыцца?»

З павагай, сям'я Крывіцкіх,
г. Маладзечна.

Ільготы па аплаце харчавання дашкольнікаў

ПЛАТА НЕ СПАГАНЯЕЦЦА:

• з бацькоў (законных прадстаўнікоў) дзяцей-інвалідаў, дзяцей, якія пакутуюць на анкалагічныя захворванні, хворых на туберкулёз, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека;

• з членаў сем'яў асоб, пералічаных у падпунктах 12.2 і 12.3 пункта 12 артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян».

ПЛАТА ЗНІЖАЕЦЦА НА 50 ПРАЦЭНТАЎ:

• для сем'яў, якія маюць трох і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў;

• для сем'яў, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання ў зоне наступнага адсялення, у зоне з правам на адсяленне і ў зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем;

• для апекуноў, прыёмных бацькоў, бацькоў-выхавальнікаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, дзіцячых вёсак (гарадкоў).

ПЛАТА ЗНІЖАЕЦЦА НА 30 ПРАЦЭНТАЎ:

• для сем'яў, якія маюць двух дзяцей, якія атрымліваюць дашкольную адукацыю, спецыяльную адукацыю на ўзроўні дашкольнай.

ІЛЬГОТЫ ДЛЯ НАВУЧЭНЦАЎ, ЯКІЯ АТРЫМЛІВАЮЦЬ АГУЛЬНУЮ СЯРЭДНЮЮ І СПЕЦЫЯЛЬНУЮ АДУКАЦЫЮ

• Бясплатнае харчаванне за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў для 13 катэгорый навучэнцаў, а таксама для чатырох катэгорый навучэнцаў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, што выдзяляюцца на ліквідацыю наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, у залежнасці ад зоны радыеактыўнага забруджвання.

Акрамя таго, навучэнцы, што пастаянна (пераважна) пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання і атрымліваюць дамашнюю адукацыю, бо па стане здароўя не могуць наведваць установы агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, атрымліваюць кампенсацыю кошту харчавання.

• Частковае або поўнае вызваленне ад платы за падручнікі асобных катэгорый навучэнцаў.

У сістэме прафесійнай адукацыі прадугледжана

• Выпускнікам устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі гарантуецца прапанова першага рабочага месца.

• Навучэнцам выплачваюцца навучальныя, сацыяльныя і спецыяльныя стыпендыі, а таксама імянныя стыпендыі за высокія вынікі ў вучобе і грамадскай рабоце.

• Навучэнцы ўстаноў, якія навучаюцца больш за адзін год, забяспечваюцца бясплатным аднаразовым гарачым харчаваннем; навучэнцы з малазабяспечаных сем'яў, а таксама іншагароднія навучэнцы ўстаноў, размешчаных у сельскіх населеных пунктах і рабочых пасёлках, — бясплатным трохразовым харчаваннем у навучальныя дні.

• Матэрыяльная дапамога на праезд аказваецца іншагароднім навучэнцам, сярэднедушавы даход сем'яў якіх па аб'ектыўных прычынах ніжэй за найбольшую велічыню бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага Урадам Рэспублікі Беларусь, за два апошнія кварталы.

• Пры праходжанні вытворчага навучання ажыццяўляюцца грашовыя выплаты навучэнцам за выкананыя работы. Грашовыя сродкі за выробленую прадукцыю (работы, паслугі) у памеры не менш за 75 % накіроўваюцца на матэрыяльнае заахвочванне навучэнцаў з улікам іх удзелу ў вытворчасці гэтай прадукцыі.

Пакрыццё расходаў па найме жылля

У выпадку незабеспячэння месцам для пражывання ў інтэрнаце іншагародніх навучэнцаў і студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў дзённай форме за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, ажыццяўляецца пакрыццё расходаў па найме жылля штомесяц у наступных памерах:

• У Мінску — тры базавыя велічыні (81,0 руб.);

• У іншых населеных пунктах — дзве базавыя велічыні (54,0 руб.).

Ільготы пры карыстанні транспартам

Навучэнцам ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі аказваецца матэрыяльная дапамога на праезд у памеры, які не перавышае 50 працэнтаў ад кошту праезду (праязнога дакумента) да месца пражывання сем'яў (бацькоў):

• не больш чым за дзве паездкі (туды і назад) у месяц аўтамабільным пасажырскім транспартам агульнага карыстання рэгулярных міжгародніх зносін, чыгуначным транспартам агульнага карыстання міжрэгіянальных ліній эканом-класа;

• не больш чым за чатыры паездкі (туды і назад) у месяц аўтамабільным пасажырскім транспартам агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносін (акрамя таксі), чыгуначным транспартам агульнага карыстання рэгіянальных ліній эканом-класа.

Ільготны крэдыт

На дзяржаўным узроўні падтрымліваюцца грамадзяне, якія атрымліваюць першую вышэйшую адукацыю на платнай аснове ў дзённай форме ў дзяржаўных установах вышэйшай адукацыі, УВА спажывецкай кааперацыі Рэспублікі Беларусь і УВА Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, шляхам выдавання крэдыту на льготных умовах (0,5 стаўкі рэфінансавання аплачваецца за кошт бюджэту).

Аб стыпендыі

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 06.09.2011 № 398 «Аб сацыяльнай падтрымцы навучэнцаў» памеры стыпендый устаноўлены ў велічынях, кратных бюджэту пражытачнага мінімуму для працаздольнага насельніцтва.